УДК 81'373.612.2:82'1

В.У. Русак, заг. кафедры, канд. філал. навук
(БДТУ, г. Мінск)

# АРТЭФАКТНАЯ МЕТАФАРА РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ КАНЦЭПТАЎ ПРЫРОДНЫХ З'ЯЎ У ПАЭЗІІ ЯКУБА КОЛАСА

Пачынаючы з канца ХХ ст. метафара ў лінгвістыцы даследуецца не толькі як спосаб папаўнення слоўнікавага запасу і сродак вобразнай характарыстыкі, але і як вынік ментальных аперацый, кагнітыўных працэсаў, спосаб светамадэлявання. Метафарычны перанос разглядаецца як увасабленне канкрэтна-пачуццёвага і рацыянальна-ацэначнага вопыту чалавека. Вучонымі заўважана, што чалавек спазнае навакольны свет пры дапамозе метафар, выяўляе вынік пазнання ў метафарычных намінацыях і ў працэсе камунікатыўнай дзейнасці зменьвае існуючую ў свядомасці моўную карціну свету, уводзячы метафарычную катэгарызацыю ў прадстаўленне ўжо вядомых і новых феноменаў [1, 2]. Метафарычны спосаб уяўленні рэчаіснасці адлюстроўвае шляхі пазнання свету і асаблівасці яго канцэптуалізацыі, а аналіз метафар дае ўяўленне аб спецыфіцы светабачання і каштоўнаснай сістэме людзей.

Даследаванне метафар у тэкстах розных аўтараў дазваляе назапасіць матэрыял і зрабіць абгрунтаваныя высновы пра актуальнасць тых ці іншых метафарычных мадэлей у ментальным лексіконе калектыву носьбітаў мовы ў пэўную сацыякультурную эпоху. Дадзеная праца прысвечана апісанню артэфактнай метафары рэпрэзентацыі канцэптаў прыродных з'яў у паэзіі Якуба Коласа – прызнанага майстра беларускага слова і чалавека, які выдатна ведаў нацыянальную культуру беларускага народа.

Пад артэфактнай метафарычнай мадэллю разумеецца метафарычны перанос, пры фарміраванні якога ў якасці адсылачных вобразаў выступаюць аб'екты, створаныя чалавекам – артэфакты. Па назіраннях даследчыцы Хамітавай Э.Р., метафарычная мадэль «прыродны аб'ект – атрыбут» адносіцца да найбольш відовішчных, паколькі «асацыятыўная сувязь у такіх метафарах ажыццяўляецца на аснове знешняга падабенства прыродных аб'ектаў і аб'ектаў чалавечых сфер» [3, с. 13].

Артэфактная метафара, якая апісвае канцэпты прыродных з'яў, у паэтычнай творчасці Якуба Коласа даволі частотная і ахоплівае наступныя сферы: матэрыялы / тканіны / ткацкія вырабы; адзежа / прадметы адзення; каштоўныя металы / каштоўныя камяні; пабудовы / часткі пабудоў; гаспадарчы інвентар / аб'екты побыту.

Надзвычай частотным спосабам канцэптуалізацыі ведаў пра прыроду ў межах даследуемага намі практычнага матэрыялу паўстаюць метафары, дзе ў якасці аб'ектаў-крыніц выступаюць **матэрыялы / тканіны / ткацкія вырабы**. Метафарызуемымі аб'ектамі ў такіх мадэлях з'яўляюцца:

**хмары / аблокі**: лёгкімі *шаўкамі* леглі ў небе хмаркі («Вясновая ноч»); сцелюць хмары *валакно* («Нягода»); хмаркі захад чуць заслалі тонкім *валаконцам* («Рольнік»); белыя *валокны* сцелюцца над долам («Адлёт жураўлёў»); белыя *валокны* сонейкам заліты («Вячэрнія хмаркі»); тонкіх хмарак *валаконцы* («Раніца вясною»); чуць прыкметна ў іх дрыжалі хмарак *валаконцы* («Заход сонца»); тонкія хмарачкі, легкакрылатыя белым *абрусам* ляжаць («Неба»);

**снег**: снег засцеле *абрусы* («У зімні вечар»); на полі белыя *палотны – абрусы* хмарак снегавых («Песні зімы»); глядзіць, як Бог зямлі, Эльбрус, і патыхае сном пустыні яго заснежаны *абрус* («З Каўказа»); мільярды халодных вясёлак убралі снягоў *абрусы* («Зімой у Балачанцы»); мне любы елкі і хваіны пад белай *пасцілкай* снягоў («Песні зімы»);

**ноч**: вісне ночы змрок *плёнкай* («Роднаму краю»); непрыкметна ноч над зямлёю свой апускае *пакроў* («Шэрая гадзіна»); злегла *воўнаю* густою цемра ночы над зямлёю («У сухмень»);

**туман**: туманы, як *плёнка*, засцілаюць лес і гай («Наш родны край»); *наміткай* туману засцілаўся луг і поле («Журба палёў»);

**поле / луг / лес**: ззяюць на лузе машэст, аксаміты і *ткань* залатая *шаўкоў* («На лузе»); зелле сцеле нам *палотны* («Глухая дарога»); рунню засцеле гмах шэры палёў, акрые *шаўкамі* даліны («Пасля зімы»); зялёны луг, як скінуць вокам, *абрусам* пышным і шырокім абапал Нёмна расцілаўся («Новая зямля»).

Такія прыродныя аб'екты, як лес, поле, лісце, расліны, у паэтычным кантэксце Коласа часта канцэптуалізуюцца ў якасці **адзежы / прадметаў адзення**: сонца развее дыханне імжы і новае вытчэ *адзенне* («Пасля зімы»); скрозь сетку *лісцянай адзежы* паказвае сонца свой твар («На захадзе сонца»); адзенуць новую *адзежу* дубы («Не тужы»); апранула зямля-матка *кажушок* зялёны («Рольнік»); толькі лес гудзе-ракоча цёмнай *шапкай* верхавін («Лес»); і, смужны *плашч* накінуўшы на плечы, ляжаць шляхі ў бярозавым вянку («Мая зямля»); убярэцца лес бязлісты ў *гарнітур* свой зялёны («Вясна»); ночка ў чорным *сарафане* робіць свой абход («У сухмень»).

Прадуктыўнасць метафары **сонца / месяц / зоры / вада – каштоўныя металы (золата / срэбра) / каштоўныя камяні** абумоўлена тоеснасцю такіх знешніх характарыстык апісваемых аб'ектаў, як колер, інтэнсіўнасць бляску: *золатам* сонца іх abлівае, месяц ім *срэбра* дарыць («Хмаркі»); ззяюць хмаркі ў *пазалоце*

(«Рольнік»); сонца ўзыдзе і рассыпле *золатам* праменне («Наша гуменца»); сонца <…> сыпле *золата* над краем і над пералескам («Усход сонца»); у хмарах знік месяца рог *залаты* («Будзе навальніца»); у небе бяздонным, дзе хмаркі купаюцца *ў золаце* яркіх агнёў («Майская раніца»); Нёман коціцца, *срэбрам*-стужкаю павіваецца («Дуб»); Свіслач дзень і ноч гоніць *срэбра* хваль («Дуб»); улонне ямы-азярынкі *срэбрам* ззяе-аддае («Мара»); унь там рачулка *срэбрам* літым бяжыць па жолабе размытым («Мой дом»); пояс *дыяментны* ткуць нябёс абшары («Вясновая ноч»); рассыпаны зоры *брыльянтавым* пухам, і Млечнага Шляху ляжаць абрусы («Наперад!»); агледзець хмар *каралавую ніць* («У летні адпачынак»); рассыпала сонца *каралі* («Салар»).

На знешнім падабенстве заснаваны і метафары, якія адносяцца да мадэлей, дзе ў якасці аб’ектаў-крыніц выступаюць:

**пабудовы і іх часткі**: цешуся я, пазіраю на вас, *вежы*-дрэвы («Старыя дубы»); ой, лес, беларускі наш лес! <…> ты песціў юнацкасць, і цешыць старога сягоння твой *полаг-навес* («Лясам Беларусі»); тады запалае нябёсаў *скляпенне* («Чымган»); скупа свеціць месяц у *акне* галін («Лес»); скрозь *сцяну* галін жывую («Новая зямля»);

**гаспадарчы інвентар і аб’екты побыту**: *сеткі* дубы нам плялі («Ліпы старыя»); вецер будзе вар’яцець, пухавую плесці *сець* («У зімні вечар»), *сноп* праменняў, пышна ўзняты («Усход сонца»); *люстра* ціхіх вод («У сухмень»).

Такім чынам, аналіз метафар, якія развіваюць артэфактную (прадметную) мадэль, паказвае яе прадуктыўнасць у працэсе рэпрэзентацыі ведаў аб прыродных з’явах. У якасці крыніцы для метафарычнай экспансіі ў аб’екты-мішэні, прадстаўленыя канцэптамі прыродных з’яў, у паэтычным кантэксце Якуба Коласа выкарыстоўваюцца канкрэтныя, добра знаёмыя артэфакты, якія маюць функцыянальную значнасць для чалавека ў паўсядзённым жыцці.

ЛІТАРАТУРА


1. Чудинов А.П. Когнитивно-дискурсивное исследование политической метафоры // Вопросы когнитивной лингвистики. №1, Тамбов, 2004. С. 91–97.

2. Рахилина Е.В. Когнитивный анализ предметных имен: семантика и сочетаемость. М.: Русские словари, 2000. 416 с.

3. Хамитова Э.Р. Концептуальная метафора «природа – человек» в русской поэтической картине мира XIX-XX веков: лингвокультурологический и лексикографический аспекты: автореф. дис. ... канд. филол. наук: 10.02.02. Башкирский гос. ун-т. Уфа, 2008. 24 с.